# РОЛЬ УЧРЕЖДЕНИЙ ОБРАЗОВАНИЯ И ОХРАНЫ ПРИРОДЫ В ФОРМИРОВАНИИ ЭКОЛОГИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ

## ЗНАЧЕНИЕ МНОГООБРАЗНЫХ СВЯЗЕЙ МАЛОЙ РОДИНЫ

***Е.В. Антонова, И.В. Ушанева***
**ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь**
**e-mail: irinaushaneva9@gmail.com**

Введение. Рано или поздно человек возвращается к истокам. Генетическая память приводит его на свою малую родину, где ему комфортно психологически. Диссонанс отступает. Человек приходит к душевному равновесию.

Анатолий Максимович Дорофеев, уроженец Городокского района, был одним из тех, кто при работе с архивными документами помог возвращению «Тараса на Парнасе» на свою историческую родину. На Гарадоччыне Анатоля Максімавіча Дарафеева вельмі любілі, можна сказаць, ён быў кумірам сярод простага люду. Намаганнямі Анатоля Максімавіча мясцовы краязнаўчы музей узбагаціўся і каштоўнай экспазіцыяй, і рэдкімі знаходкамі. Але асабліва адметны след пакінуў спадар Дарафееў у справе захавання літаратурнай спадчыны Гарадоччыны, ды і цалкам Віцебшчыны, усёй Беларусі – адкрыццём памятных знакаў, прысвечаных геніяльнай паэме «Тарас на Парнасе». Ананімны аўтар класічнага твора сярэдзіны XIX стагоддзя набыў канкрэтныя рысы гарадоцкага мешчаніна, ураджэнца вёскі Астраўляны Канстанціна Вераніцына. Зразумела, высвятлялі сапраўднае аўтарства аўтарытэтныя сталічныя літаратуразнаўцы. Але наш шаноўны Анатоль Максімавіч не дазволіў схаваць справу ў доўгую скрыню. У снежні 2001 года ў Гарадку адбылося сапраўднае «ўзыходжанне на парнас памяці». Цудоўна падрыхтаваная імпрэза ператварылася ў народнае свята з жартамі і песнямі. У ролі Тараса выступіў наш няўрымслівы Анатоль Максімавіч. У нацыянальнай кашулі, саламяным капелюшы, ён парадаваў землякоў бадзёрым настроем, сапраўдным народным гумарам. З таго самага часу ў Гарадку за Дарафеевым замацавалася другое імя – «наш Тарас» [1, 2].

Цель: отразить роль талантливых личностей в жизни малой родины.

Актуальность: восстановление утраченных связей с историческими корнями обогащает современную жизнь малой родины.

Материал и методы: сопоставительный анализ публикаций в районной газете “Гарадоцкі веснік”.

Результаты и их обсуждение. На Гарадоччыне, пачынаючы з 1997 г., рэгулярна праходзяць Вераніцынскія краязнаўчыя чытанні, тэматычныя канферэнцыі, конкурсы, мастацкія пленэры, выязныя экскурсіі. У 2001 г. ля

Репозиторий ВГУ

Гарадоцкага раённага краязнаўчага музея і ў в. Астраўляны ўсталяваны памятныя знакі ў гонарпаэмы «Тарас на Парнасе» і яеаўтара, а ў 2014 г. у скверы па вул. Савецкай у райцэнтры – выдатны помнік палясоўшчыку Тарасу (аўтар помніка Сяргей Сотникаў). Падчас урачыстасці ля скульптурнайкампазіцыі «Тарас на Парнасе» ўскладаюццажывыякветкі. З 2009 г. кожны чэрвень ладзіцца раённае свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас». Усё гэта становіцца брэндам Гарадка [3, 4].

Наколькі прыцягальнымі для творчасці застаюцца вобразы людзей і краявідаў, створаныя К. Вераніцыным, што ў рамках свята праходзяць раённыя конкурсы тэматычных вырабаў народных майстроў і мастакоў «Ці знаў хто з вас, браткі, Тараса?»Традыцыйную акцыю «Чытаем паэму разам» падтрымалі настаўнікі і вучні школ Гарадоччыны. Гумарныя радкі паэмы ўжо другое стагоддзе з вуснаў у вусны перадаюцца многімі пакаленнямі беларусаў і, як калісьці, выклікаюць усмешкі трапнасцю дыялектнай мовы нашай мясцовасці, сакавітых вобразаў.«Сцежкамі Тараса» па маршруце Гарадок-Астраўляны-Гарадок, па авеяных легендамі дарогах, якімі хадзіў і К. Вераніцын, праходзіць велапрабег. У шэрагу святаў Вераніцынскі фэст стаіць асобкам. Ён ладзіцца выключна ў Гарадку і дазваляе нам яшчэ раз азірнуцца на сваю мінуўшчыну, з гонарам узгадаць, якога вялікага чалавека нарадзіла наша зямля [5].

Святло яркай бліскавіцы таленту Канстанціна Вераніцына даходзіць да нашых дзён у выглядзе свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору – свята прыгожага, вялікага, шчырага, як душа людзей, якія спакон вякоў жывуць на гэтай зямлі [3]. Мелодыі напеваў, гукі роднай мовы, стражытныя абрады, традыцыі, нацыянальныя касцюмы…“мілыя вобразы роднага краю, смутак і радасць мая”… Дорогие, знакомые с детства любимые уголки природы … Человек с возрастом возвращается в мыслях к ним всё чаще и чаще. Невидимая сила тянет человека к его истокам. И только, когда он оказывается на своей малой родине, пройдет тропинками детства, наступает душевный покой. Не потому ли, что восстанавливаются некоторые звенья, связывающие человека с духом предков.

Заключение. Таким образом, талант Анатолия Максимовича Дорофеева как грани кристалла сияет и сейчас вдохновляет и путь озаряет. Изучение истоков, корней делает жизнь содержательней, интересней, наполняет глубоким смыслом, показывает окружающий нас мир во всем многообразии связей и отношений [6].

Литература


1. http://news.tut.by/society/374527.html
2. http://nspaper.by/2011/08/29/anatol-darafee-yekolag-nastanik-patryyot.html
3. http://www.garadvest.by/2016/05/svyatlo-pralitae-na-imya
4. http://www.kp.by/daily/26316/3194788/
5. http://www.garadvest.by/2016/06/garadocki-parnas
6. Дубров, А.П. Музыка и растения / А.П. Дубров. – М.: Знание, 1990. – 64 с.




Репозиторий ВГУ